Так думае і, бадай, скажа кожны беларус ці асоба іншай нацыі, якая нарадзілася і вырасла на Беларусі. Але ж больш за ўсё, здаецца, гэтыя пачуцці бліжэй тым, хто вырас, як кажуць, "на сяле". І для такога погляду ёсць свае высновы: вельмі ранняе сутыкненне з рэчаіснасцю і такое ж ранняе, пад уплывам навакольнага асяроддзя, фарміраванне характару і самастойнасці. Ніхто не водзіць, але ж і няма калі за працай, за руку да самага школьнага ўзросту, не заўсёды па гадах праца. Але пад вокам бацькоў, старэйшых таварышаў, вяскоўцаў яна ў радасць. Якія ж абураюць пачуцці, калі ўдаецца зрабіць так, як цябе вучылі!

Прычынай добрага настрою і вялікага ўражання можа быць і спрытна пастаўлены ў аглоблі конь, і калі плуг "пайшоў" роўна, без хібаў і не выскоквае раз-пораз з зямлі, і калі касой не дзяўбеш сенажаць, і роўна, з размахам пакладзеш сенавоз...

З радасцю бяжыш у школу за некалькі кіламетраў, робіш урокі, а пасля знаходзіш часіну пабываць з сябрамі ў лесе, на рэчцы... І зноў праца. Праца, каб быць чалавекам. Праца, каб забяспечыць жыццё. Праца, каб зрабіць што-небудзь добрае і карыснае. І ў гэтым цуд вясковага жыцця, яго адвечнай прывабнасці і прыгажосці.

Пазней, калі пройдуць дзяцінства і юнацтва і будзе зроблены крок "у людзі", грамадства паспрабуе пасмяяцца з цябе за сацыяльнае паходжанне, з таго, што дрэнна гаворыш па-руску. Так, так! У недалёкім мінулым вясковыя школы амаль усе былі беларускамоўнымі. Гэта потым — у 70—80-я гады — яны сталі рускамоўнымі. Беларускую мову пачалі вывучаць як замежную некалькі гадзін у тыдзень. З жалем і пачуццём няёмкасці, але ж прыходзілася пераходзіць на мову большасці — рускую. Цяпер іншы раз у жыцці з аднаго і таго ж выпадку зноў тыкаюць пальцам у вочы ўжо за тое, што гаворыш па-руску. Зневажанне на гэтай аснове даходзіць да краёў. Нейкім "інтэлігентам" здалося, што пераход на беларускую гаворку такі ж просты, як пераключэнне тэлевізара на іншую праграму.

А можа, Бог і не абдзяліў іх разуменнем усёй складанасці гэтай з'явы. Але ж тады мы павінны гаварыць аб наўмысных іх паводзінах наконт знявагі за рускамоўнасць.

Гэтыя радкі даліся і мне, карэннаму беларусу, скончыўшаму беларускамоўную сярэднюю школу ў вёсцы Лукі Карэліцкага раёна (у маёй вёсцы Крышаноўшчына была сямігодка), скончыўшаму дзве вышэйшыя навучальныя ўстановы, нялёгка. Адчуваецца, што пройдзе час і родная мова, бадай, сама вернецца да нашых вуснаў. Бо яна дзяржаўная, бо без яе сёння калі не немагчыма, то вельмі цяжка. Я не абуруся, калі мяне папікнуць, што я ем беларускія каўбасы, а па-беларуску гавару дрэнна. Гэта праўда. Я — радавы грамадзянін, невялікі чыноўнік Канстытуцыйнага суда. І добра ведаю, што ніхто не абмакне пяро ў чарніла, каб пакрытыкаваць мяне за маё прызнанне.

Іншая справа, калі на маім месцы апынецца высокая дзяржаўная асоба, хоць і ў мастацкім вобразе. Але ж, прыдумаўшы вобраз, можна пасмакаваць.

У кожнага, бадай, было чым пачаставацца і было што пасмакаваць больш рэчаіснае, чым плёткі, на Новы год і Каляды. І на Вялікдзень.

Вядзьмак Лысагорскі, зажмурыўшы вочы і таму не ўбачыўшы гэтага, вырашыў перад святамі "выкінуць каленца" і падкінуць нам ласунак у выглядзе новай паэмы "Лука Мудзішчаў —прэзідэнт". Герой Ведзьмака і вясковец, і неадукаваны, і гаворыць па-руску, і не сябруе з беларускай мовай. Як жа такі герой, насміхаецца Вядзьмак, пасмеў стаць Прэзідэнтам?!

Паважаны Вядзьмак Лысагорскі! Ваш герой — тыповы прадстаўнік майго пакалення. Ён, як і мільёны другіх, не павінен у тым, што нарадзіўся недзе далёка ад Мінска, "на границе с Россией", што ён вырас на сяле і навучаўся ў нашай нацыянальнай школе і працаваў у сацыялістычнай дзяржаве, у якой мала хто гаварыў на роднай беларускай мове. Сацыялістычную дзяржаўнасць парушыць, як і стварыць, было суджана не Вашаму герою, а другому — ужо не герою паэтычнага твора, а рэальнаму чалавеку. Праўда, гэтых рыс Вы не надаяце свайму герою, бо, відавочна, сумленне ўсё ж такое-сякое ў Вас засталося. Хаця, прабачце, Вы абяцалі, што паэма "далей будзе", але ж хапіла духу толькі на адказ Лукі на Вашу паэму. З Вашых гэтых "твораў" відаць, што на працягу паэмы свайму герою Вы надасце такія рысы, якія яшчэ больш адлюструюць не толькі асабіста яго, але і нас, аднаго з ім і старэйшага пакалення людзей. На мой погляд, гэтых адмоўных рыс ужо нямала Вамі паказана. Лепш паглядзіце на свайго героя з іншага боку: ён працавіты, мае характар, не парушаў законы, закончыў дзве ВНУ, абраны дэпутатам, а потым і прэзідэнтам. Вы нават паведамляеце чытачам, што Ваш прэзідэнт абраны большасцю выбаршчыкаў.

Як Вы думаеце, Вядзьмак Вядзьмарыч, калі Вы крытыкуеце так абразна свайго героя, ці не закранаеце гонару і годнасці большасці таго народа, які абраў яго? Канешне. Але ж Вам, дзякуй Богу, не хапіла таленту, каб давесці задуманае да канца. Усё ж выказаныя абразы Вы хацелі б узмацніць, яны Вас не задавальняюць. На што, на што, а на абразу, гавораць, талент не патрэбны. Можа, тут справа ў іншым?

Паглядзіце з боку на свой твор. Вы ўбачыце, раскрыўшы вочы, што чамусьці добрыя рысы Вы палічылі кепскімі, што аб дрэнным сказана, спасылаючыся на станоўчыя прыклады з жыцця героя, што Вы змяшалі якасці характару героя з яго палітычнай дзейнасцю. У Вас, можа, ёсць канструктыўныя меркаванні па напрамках палітыкі, рэалізацыя якіх палепшыць наша жыццё? Тады параю Вам: калі Вы маеце на ўвазе якую-небудзь канкрэтную асобу, напішыце ёй ліст і парайце зрабіць інакш, абгрунтуйце сваю думку. Праўда, пры такім падыходзе да справы газета "Свабода" не надрукавала б панегірык аб тым, што Вядзьмак Лысагорскі (хоць ягонае сапраўднае імя застаецца невядомым) "клясык" беларускай літаратуры. Дарэчы, дзіўна і тое, што імя аўтара паэмы газеце невядома, але ж яна, як бачым, ведае, што гэтае імя адносіцца да "клясыкаў". Можа, толькі за тое, што "Свабодзе" так спадабаўся твор?

Калі Вы, Вядзьмак Вядзьмарыч, упарты чалавек і злосны як... і не паслухаеце мяне, то ў другой частцы паэмы напішыце ўсё ж, што ў той дзяржаве ўжо былі розныя прэзідэнты: і вучоныя, і "вялікія" палітыкі, што яны зрабілі з яе народам і самой краінай.

Ці ў Вас творчых здольнасцей не хопіць на гэта? Помніце, як у М.Прышвіна пастушок, які знаходзіўся на начным доглядзе коней на лузе каля рэчкі, крытыкаваў пісьменнікаў за тое, што яны мала, у сэнсе коратка, і дрэнна пішуць. Вось я б, гаворыць пастушок, напісаў бы! Што? — пытаецца субяседнік. "Кусты, возера і качкі — ціў-ціў-ціў". Пастушок змоўк. А далей? Пастушок адказаў: і так усю ноч. Няўжо гэтага мала?

Сапраўды, супраць Лукі "мастака-прамоўцы" і кіраўніка дзяржавы невядомай Вы выглядаеце маленькім прышвінскім пастушком з яго ціўканнем.

Пад канец скажу, што "сабе на згубу" я не галасаваў, аднак такіх палітычных рэверансаў цярпець нельга і за гэтае сумленнае слова "дзякуй" ні ад кога не чакаю. Сёння ўжо галоўнае, не хто за каго галасаваў. А хто і як працуе і спрыяе наладжванню адносін і жыцця. А Вы, мусіць, ужо атрымалі "дзякуй" ад забудоўшчыкаў другой будучыні Беларусі. Я таксама падзякаваў бы за ўвагу да майго ліста і за тое, каб Вы яшчэ напісалі, што Ваш герой у рэшце рэшт вывеў краіну з крызісу і ягоны народ зажыў дружна, у дабрабыце і шчасліва. Гэта галоўнае.

З павагай — Міхась ВОЛЧАК.

ПРЕСТУПЛЕНИЕ И НАКАЗАНИЕ

Владимир КАРАВАЙ, председатель Верховного суда Республики Беларусь:

"Сила наказания не в его жестокости, а в его неотвратимости"

Хорошо быть строгим. Лучше — быть добрым. А еще лучше — справедливым.

Мне чаще других приходит на память этот постулат из народной юриспруденции, когда размышляю над публикациями в средствах массовой информации, затрагивающими деятельность судов Республики Беларусь. Выражая серьезную тревогу и озабоченность ростом преступности, их авторы нередко пытаются объяснить это ошибками судов в назначении мер уголовного наказания, их гуманизацией, упрекнуть, что именно суды "уводят" преступников от ответственности. Суждения строгие. Но всегда ли справедливы?

Безусловно, судейский труд оказывает огромное воздействие на общую криминогенную обстановку, на результативность борьбы с преступностью. Хотя бы потому, что через залы судебных заседаний проходят множество людей, и с каждым годом, к сожалению, все больше. И по приговорам и решениям наши граждане судят об уровне в обществе все той же справедливости. Вот смотрите. Количество только уголовных дел, рассмотренных судами в прошлом году, увеличилось более чем на 5 тысяч. В 1993 году было осуждено почти 48 тысяч человек, в 1994 — свыше 54. Общая же судимость по республике возросла за это время более чем на 12 процентов. Сколько знаний, выдержки, самообладания, психологической выносливости нужно проявить, сколько душевного напряжения потратить, чтобы по недостаточной исследованности доказательств не отойти в сторону от истины, а по невнимательности не найти оснований для милости. Труд судьи необычен, его "детали" — человеческие души, потому судить о качестве этого труда лишь по сухой судебной статистике не совсем и не всегда объективно.

Буду самокритичен. Действительно, некоторые суды допускают назначение необоснованно мягких мер наказания. По этому основанию в истекшем году отменены приговоры в отношении 425 человек, в основном по делам о корыстных преступлениях. Но правда и то, что попавшие на скамью подсудимых за посягательство на жизнь и здоровье людей отбывают наказание в соответствии с тяжестью содеянного там, где это определено законом.

К слову, мы стали глубже анализировать практику мер наказания, усилили судебный надзор. В результате на данном направлении судебной работы обозначились серьезные изменения — сужается сфера применения лишения свободы к лицам, совершившим преступления впервые, социально неопасные по своему характеру. Убежден, что в этих случаях не жестокость, которая, как правило, пробуждает жестокость, а выбор в рамках закона более либеральной меры наказания, чем прохождение "преступного семинара" в местах лишения свободы, лучше послужит профилактике преступности и борьбе с ней.

Суды всех инстанций стали более требовательно подходить к оценке материалов предварительного следствия, принципиальнее реагировать на любые нарушения законов. В 1994 году на новое расследование направлено почти каждое десятое дело. Понимаю, это дорогостоящий для правосудия шаг, но необходимость его пока очевидна. Вынесение приговора по сложным, запутанным делам требует особой тщательности от следствия, небрежность, необъективность, поспешность в ходе которого крайне усложняет поиск истины в суде.

В последнее время вскрыто немало ошибок прошлых лет, восстановлены нарушенные права и доброе имя невиновных. Только в минувшем году оправдано 193 подсудимых, обвинявшихся в том числе и в тяжких преступлениях — умышленных убийствах, изнасилованиях, экономических преступлениях. Можно сказать и о том, что оперативнее и полнее разрешаются гражданские иски в уголовных делах по возмещению вреда, причиненного противоправными действиями, что в условиях инфляции имеет немаловажное значение для пострадавших.

Словом, суды и судьи не [illegible] тому, что предпринимается в республике по утверждению правопорядка и законности. И все же, образно говоря, суды — это социальные хирурги, берущие в руки нож правосудия чаще всего тогда, когда другие средства исчерпаны. Поэтому пытаться углядеть в их действиях чуть ли не первопричину криминализации общества равнозначно попытке поставить некоторые явления и представления с ног на голову. Правильнее было бы эту проблему рассматривать с учетом политических, социально-экономических, организационных, кадровых и иных условий, сложившихся в обществе. Плюс к этому — радикальное обновление законодательства, общее снижение законопослушания граждан, усиление нравственного и духовного опустошения населения, что также влечет нарастание криминогенности, ухудшение общего состояния преступности и законности.

Однако не станем делать этого, тем более, что есть кому этим заниматься кроме нас. Лучше зададимся вопросом: что большего могли бы сделать суды совместно с правоохранительными органами, чтобы помочь нашим гражданам осознать право как самый надежный, не подверженный коньюнктуре регулятор общественных отношений? К тому же, недавно "Народная газета" пригласила к такому разговору, открыв новую рубрику "Преступление и наказание".

И снова обращусь к тому, с чего начал. Справедливость, применительно к нашему разговору, это когда каждый осознает, что причиненное зло вернется к нему точно в таком виде, когда за деяниями неминуемо последует воздаяние. Иными словами, когда за совершенное преступление **неотвратимо** последует наказание. Вот, на мой взгляд, стержень работы всех правоприменительных органов, одно из слагаемых успеха в обеспечении законности и правопорядка. Поскольку язык цифр зачастую бывает красноречивее литературных изысков, использую их снова, а читатель пусть судит сам.

В прошедшем году зарегистрировано более 120 тысяч преступлений, в суды направлено менее 40 тысяч дел. Почти на 10 тысяч человек, совершивших преступления и установленных органами следствия, дела опять же в суды не поступили. Фактически в судах не рассмотрено ни одного серьезного дела, связанного с экономическими, государственными преступлениями. Да, законодательство в этом плане пока несовершенно. Но все же не в такой степени, чтобы ни одна "акула" не попала в сети правосудия. Вроде получается, что направляются дела в суды в "порядке исключения". Но такая формула соединяет в себе два антипода. Порядок, если это порядок, не может мириться с исключениями из него. Поступая так, можно породить лишь чувство безнаказанности.

Увеличилось количество нераскрытых преступлений — в прошлом году 41 тысяча, а с учетом прошлых лет — почти 160 тысяч. Среди таковых и заказные убийства.

Значительное еще число дел, прекращаемых производством по нереабилитирующим основаниям. Таким вот образом многие граждане во внесудебном порядке освобождаются от уголовной ответственности. Как видим, еще так много предстоит сделать, чтобы каждый преступивший закон получил по заслугам. И в первую очередь необходимо исключить возможность прекращения уголовных дел до суда по нереабилитирующим основаниям.

Законность и справедливость наказания — лишь одна сторона дела. Другая — в надлежащем его исполнении. Ни для кого не секрет: исправительные учреждения переполнены, санитарно-эпидемиологический режим не соблюдается, порядка 70 процентов осужденных не заняты общественно полезным трудом, ограничены возможности для обучения, практически свернута воспитательная работа. А суды поставляют в ИТУ все новых и новых "клиентов". В связи с этим хочу подчеркнуть, что назрела острейшая необходимость в коренном реформировании законодательства, в приведении его в соответствие с реалиями жизни. Это, с одной стороны, устранит правовые пробелы, которые сегодня преступники используют в своих целях, с другой — даст большие возможности судам для реализации принципа индивидуализации наказания с учетом характера преступления, обстоятельств его совершения, личности преступника, отношения виновного к содеянному.

Законодательного разрешения требует и проблема социальной реабилитации осужденных. Возвращаясь из мест лишения свободы, бывший заключенный в настоящее время нередко не имеет ни жилья, ни работы, ни средств к существованию, что, как правило, вновь приводит его на криминальную стезю. Итог? Почти каждое третье преступление на счету ранее судимых. В последнее время наблюдается и новое явление — нежелание отбывших срок оставлять колонию. Скажите, когда в нашем государстве казенный дом был желаннее родного очага? Это ведь серьезная социальная проблема, которую ужесточением наказания не решить, от которой никакой суд "не уведет".

С принятием Закона "О судоустройстве и статусе судей в Республике Беларусь" складываются принципиально новые условия для работы судейского корпуса. В нем развиты конституционные принципы деятельности суда, определен правовой статус судей, закреплены материальные и социальные гарантии, расширено судейское самоуправление, введено единоличное рассмотрение некоторых категорий дел, что упростит судебную процедуру. Все это, безусловно, послужит повышению эффективности правосудия. Но нельзя в связи с этим не видеть новых трудностей, которые возникнут в связи с реализацией закона, прежде всего из-за недостаточного его организационно-материального обоснования на стадии принятия. И первая — введение с 1 января 1996 г. суда присяжных. Да, этот суд демократичен. Но демократичность эта сама по себе вряд ли может быть полноценной. Ее ценность определяется тем, насколько способствует правильному применению законов и вынесению правосудных приговоров. На мой взгляд, правовое мышление, законодательство, материальная база судов, а главное — финансово-экономическое положение в стране не позволяет ввести этот правовой институт в обозначенные сроки.

Другая проблема — кадровая. Безусловно, новый правовой, социальный статус судей, определенный упомянутым законом, облегчит задачу закрепления судей, многие из которых прежде оставили работу в ведомстве Фемиды, уйдя в более "доходные" структуры. Предстоит укомплектовать имеющиеся еще практически во всех судах вакансии, особо заботясь при этом о качественном улучшении судейского корпуса. Мы сегодня нуждаемся в юристах новой школы — школы прав человека. Как бы кто ни уповал на ужесточение наказаний, в основе такой школы лежит общедозволительное, а не запретительно-ограничительное понимание правовых норм. Здесь есть над чем поразмыслить и тем, кто подбирает кандидатов на судейские должности, и тем, кто готовит юристов в учебных заведениях.

Наряду с этим следует позаботиться о безопасности судей, а также защите прав свидетелей, потерпевших. На каждом шагу приходится сталкиваться с различными способами давления на судей, создания нервозности вокруг процессов, что не способствует обеспечению правосудности приговоров. Не в лучшем положении и другие участники процесса. Публичное оглашение их имен, адресов места жительства и работы иначе как издевательством над здравым смыслом не назовешь. Ведь за этим нередко следуют угрозы физической расправы со стороны оставшихся на свободе преступников, их родственников, друзей.

Сегодня мы много говорим о диктатуре Закона, о верховенстве в обществе права. Право, как говорил историк Яков Кротов, это некоторая узда. Но узда плетется не для того, чтобы поработить лошадь, а чтобы куда-то на ней ехать. Наше направление — правовое государство. Но для этого надо, чтобы и власть имущие, и им подвластные стали боготворить Закон. А те, кто наделен правом его применять, делали это одинаково профессионально и честно, не пытаясь в другом ведомстве искать виновных в собственных просчетах.



Малюнкі Алега ПАПОВА.

Тема дня

Владимир СОЗОНЧУК:

"Преступников жалеть нельзя!"

Может ли защитить себя общество от нынешнего криминального беспредела? — вот вопрос, который сформулирован мною литературно-округло. Словом, я обобщил те вопросы, которые задают люди в многочисленных письмах в редакцию. Причем ставят они их, что называется, ребром и конкретно. Сколько можно терпеть и бояться? Почему такой мягкий приговор вынесен конкретному К., неисправимому бандиту? До каких пор власти будут много говорить о борьбе с преступностью, но мало делать? Почему...

Но не будем, видимо, продолжать вопросы читателей. Тема понятна и так. Особенно после недавнего убийства (до сих пор нераскрытого) Влада Листьева — телевизионного кумира и в России, и у нас.

Поэтому мы обратились к человеку, который каждый день сталкивается с преступностью и преступниками по долгу службы — следователю по особо важным делам прокуратуры Минской области, советнику юстиции Владимиру Степановичу СОЗОНЧУКУ. И попросили его высказать свою точку зрения по теме, которая волнует всех...

— То, что в России сейчас уголовный беспредел — очевидно. Наша Беларусь в немного лучшем положении. Но это отставание небольшое, затишье обманчивое. Границы есть для органов, ведущих борьбу с преступностью. Для преступников — границ нет. Судите сами. В 1994 году в Беларуси совершено только умышленных убийств около тысячи. Из них многие остались нераскрытыми. Наша доморощенная преступность вместе с преступностью российской нас захлестнет, если мы не противопоставим ей систему срочных и эффективных мер.

— Что вы имеете в виду конкретно?

— Есть ряд таких мер, которые очевидны, принятие их не терпит отлагательства. Это в первую очередь разработка и принятие новых Уголовного и Уголовно-процессуального кодексов. Именно они являются теми рычагами, которые могут сдвинуть дело с мертвой точки. Ведь принимаются законы о чем угодно, даже по тем незначительным вопросам, по которым и постановления правительства достаточно. Но жизненно важные для общества законы запаздывают. Почему? Этот вопрос я сам хочу адресовать законодателям. Почему не напечатаны проекты вышеупомянутых кодексов? Почему даже мы, практические работники правоохранительных органов, с ними не знакомы? Разработчики могут сказать, что кодексы не готовы, чтобы их принять, что очень сложна работа по их подготовке. Согласен. Но время не ждет. Почему тогда не вносятся изменения в уже существующее законодательство?

И что интересно, многие сейчас предъявляют претензии к судьям за "мягкотелую" карательную практику. Например, народный депутат Беларуси прокурор Брестской области В.Любовицкий также высказывает в "Народной газете" (N 29) свою обиду в адрес судей, утверждая, что преступников стало бы меньше, если бы судьи помогали прокурорам.

По-моему, не нужно прокурору просить помощи у судей. Все решается проще. Для этого есть Верховный Совет как высший законодательный орган. Примите завтра закон и измените им ст. 42 Уголовного кодекса, "благодаря" которой суды выносят мягкие приговоры. Отменять ее полностью, конечно, нельзя. Есть ряд преступлений и конкретных лиц, в отношении которых она должна действовать, которым нужно назначать наказание ниже низшего предела, смягчать приговор в силу явных смягчающих обстоятельств. Но эта статья не должна применяться к преступлениям и преступникам, которые можно назвать особо опасными: лицам, совершившим умышленные убийства, бандитизм, разбои, грабежи, рэкет и т.д.

И все. И уже послезавтра карательная политика судей станет жестокой. Просто нужно не говорить, а действовать. Общество ждет от власти, от депутатов конкретных решений, а не разговоров. Судья будет подчиняться закону, и не нужно будет его упрекать, а прокурору просить у него помощи.

Далее. Введите в кодекс понятие "заказное убийство" и наказание за него — смертную казнь. Либо, как исключение, пожизненное заключение. И судья вынужден будет быть строгим.

— Тема смертной казни постоянно на слуху. Одни "за", другие — "против". А что вы скажете?

— Я думаю, что в наше время да в наших условиях ни один здравомыслящий человек, болеющий за общество в целом и каждого гражданина в отдельности, не станет предлагать ее отмену. Не то время.

Это неправда, что жестокость наказания не влияет на сокращение преступности. Влияет! Не повлияет она на количество бытовых убийств, когда муж жену и, наоборот, она его в порыве гнева или в момент измены убьет. Тогда человек действительно не думает, что с ним будет и как его накажут.

Но таких лиц никто и не станет приговаривать к расстрелу. А тот, кто соглашается убить человека за вознаграждение, у кого есть время подумать, что будет, когда его поймают, если он будет знать, что именно за это будет расстрелян, а не отделается 15 годами, — то подумает. И многие откажутся идти на преступление.

В этом контексте, по-моему, очень важен вопрос гласности. "Народная газета" один раз, помню, опубликовала заметки о лицах, приговоренных к расстрелу, которым было отказано в помиловании, с кратким описанием содеянного ими. Хорошая статья. Жаль, что на этом вы поставили точку. Этого мало. Каждый расстрельный приговор должен быть доведен до сведения общественности. И это будет демократично и гуманно.

Недемократично и незаконно то, что в Узбекистане органы милиции без суда и следствия расстреляли несколько банд, о чем Б.Ельцин в Останкино сказал как о чем-то, достойном подражания. С такой постановкой вопроса согласиться трудно. Это уже беззаконие, путь к репрессиям и произволу со стороны государства. Не дай нам Бог вернуться к подобным несудебным мерам.

А вынесенный судом, а еще лучше — при присяжных заседателях приговор подонку, даже если он смертный — это благо для общества. И не надо бояться, если таких приговоров будет много. Не нужно скрывать эти цифры. Наоборот, нужно их афишировать! Общество обязано себя защитить. Ромен Ролан говорил, что жалость по отношению к палачам оборачивается жестокостью по отношению к жертвам. И это так. А.Лабрюйер добавлял, что наказание преступников — это пример для всех негодяев.

— Но можно ведь увеличить сроки лишения свободы, вплоть до пожизненного заключения?

— Решение о лишении жизни человека, пусть даже это убийца, — очень, конечно, непростое решение для лица, его выносящего. Но пусть тогда тот, кому решили сохранить жизнь, сидит изолированный от людей до конца дней своих. Я за такую постановку вопроса.

А то вот как получается. По законченному мною в прошлом году уголовному делу по обвинению ранее восемь раз (!) судимого К. с 18 до 43 лет просидевшего в тюрьмах и вновь совершившего умышленное убийство, Минский облсуд приговорил его к расстрелу. А Верховный суд изменил приговор на 15 лет лишения свободы, хотя никаких смягчающих обстоятельств не было. А был бы закон, дали бы ему пожизненное заключение и пусть бы сидел. На перевоспитание такого надеяться уже не приходится. Хотя бы потому, что написал десятки жалоб, не признавая вины, отрицая очевидные факты и выкручиваясь как только можно, пытался увернуться от возмездия.

— А перевоспитать, исправить преступника? Это возможно, как утверждают многие, или нет?..

— Это отдельный вопрос. Ведь и 15 лет лишения свободы как максимальная мера придумана в "добрые" старые времена, когда мы строили коммунизм и всему миру рассказывали о том, что все у нас сознательные. А если кто и совершил преступление, то мы его перевоспитаем. Пора отбросить эту химеру! Наказание — в первую очередь кара за содеянное преступление, и она должна быть соразмерна ему. По крайней мере, повторюсь, так будет гуманно по отношению к жертве. А поэтому вопрос о длительных сроках лишения свободы, вплоть до пожизненного заключения, — первоочередная мера, которую уже завтра нужно и можно реализовать.

Ведь неужели кому-то "доброму" не понятно, что бандитам, грабящим с оружием в руках людей на дороге, если им сегодня по 20 лет, нужно дать по приговору хотя бы 50, чтобы к моменту возврата в общество они уже второй раз на дорогу не вышли. А того, кто совершил кражу или угон, или даже хулиганство без отягчающих обстоятельств, на первый раз можно иногда и вообще простить или ограничиться условной мерой наказания. Но настоящие бандиты должны сидеть в тюрьме!

Далее. Нужно срочно отменить принцип поглощения более мягкого наказания более тяжким. Меры наказания должны только плюсоваться.

Словом, я попробовал обозначить лишь несколько моментов из череды многих, которые стоят на повестке дня и которые нужно безотлагательно решать. Уверен, что даже эти изменения позволят внести перелом в вопрос, стоящий на повестке дня: или бандиты нас, или мы их. Ждать нельзя. Промедление, что называется, смерти подобно. Лично я, как профессионал, это хорошо понимаю. И мои коллеги — тоже.

Жаль только, что наши слова и мнения — мнения практиков! — наши законодатели пока не слышат...

❑

Вот на такой ноте закончился наш разговор с Владимиром Степановичем Созончуком. Вернее — начался, но не завершился. Ставить точку на этой теме редакция "Народной газеты" не собирается. Тем более что новому составу Верховного Совета от этой темы тоже не уйти...

Вел беседу Павел СТАСЕВИЧ.

Крымінальныя драмы

Ваенныя бліндажы працягваюць забіваць

Жудасны лёс напаткаў бабруйчаніна і яго таварыша, рабочага вытворчага аб'яднання "Белшына". Разам яны апрацоўвалі прысядзібны ўчастак і нечакана праваліліся... ў бліндаж часоў Вялікай Айчыннай вайны. На жаль, выбрацца сябры не змаглі, бліндаж стаў месцам іх гібелі — атруціліся газам, састаў якога пакуль што ўстанавіць не ўдалося.

Гуляе банда па дарозе

Начальнік крымінальнага вышуку рэспублікі палкоўнік міліцыі Мікалай Губскі тэрмінова вымушаны быў выехаць у Валожынскі раён, адкуль паступіла паведамленне аб разбойным нападзе адразу на тры легкавыя машыны.

Злачынства ўчынена а палове шостай раніцы. Чацвёра чалавек, двое з якіх былі ў міліцэйскай форме старога ўзору, спынілі жэзлам спачатку "дзевятку" і ВАЗ-21043, якімі кіравалі жыхары Варонежа. Трэцяй ахвярай стаў дырэктар мінскага таварыства з абмежаванай адказнасцю, ён страціў машыну замежнай маркі. Злачынцы завалодалі легкавушкамі і паімчалі па трасе Мінск—Вільнюс. Праз паўгадзіны адну легкавушку, але, на жаль, ужо абгарэлую, знайшлі ў лясным масіве непадалёку ад месца злачынства. Пра дзве астатнія пакуль што нічога невядома.

Міліцыя разгарнула пошукавыя мерапрыемствы. Апоўдні — новае трывожнае паведамленне: на гродзенскай трасе зноў замаячылі злачынцы, якія маскіруюцца міліцэйскай формай. Зайшлі яны ў прыватнае кафэ і пад пагрозай пісталета прыхапілі 16 бутэлек каньяку, віно і прахаладжальныя напіткі.

Агонь забраў цэлую сям'ю

Адразу пазбавіліся жыцця чацвёра з пяці членаў сям'і ў вёсцы Сідаравічы Магілёўскага раёна. Вечарам успыхнуў іх дом. Пакуль прыйшла дапамога, загінула ў агні маці, прадаўшчыца магілёўскага магазіна, і дзеці — сын, вучань 10-га класа школы-інтэрната, і дзве дачкі, вучаніцы 6-га і 4-га класаў. Застаўся жывы толькі бацька, ды і той з цяжкімі апёкамі ляжыць у бальніцы.

Уладзімір СТРЭЛЬСКІ.

Папаўся... і з аўтаматам

Без адзінага выстралу абяззброілі работнікі міліцыі бабруйскага рэкеціра і забралі ў яго аўтамат Калашнікава з патронамі да яго, пісталет з глушыцелем.

"Засвяціўся" грабежнік на аўтамашыне "Опель". Чацвёра маладых бабруйчан выехалі на сваёй машыне ў Кіраўскі раён на лясны бераг ракі Бярэзіны адпачыць. Але ўрачыстасць азмрочыў тып, які выйшаў з лесу, узброены аўтаматам, у армейскай форме, у масцы. Пагражаючы зброяй у літаральным сэнсе, паклаў на зямлю чацвёрку маладых людзей і загадаў не рухацца. Пакінуў ім запіску і растлумачыў, што там усё сказана. Сеў у "канфіскаваны" "Опель" — і знік. Апамятаўшыся, юнакі прачыталі запіску, у якой быў ультыматум: ганіце восемсот доляраў, тады вярну аўтамашыну.

У аперацыю па затрыманню ўзброенага бандыта ўключыліся работнікі міліцыі Бабруйска і Кіраўска. Вылічылі яго і "накрылі" з усім яго ўзбраеннем. Знайшлі і аўтамашыну, якую ён схаваў у свайго сябра ў вёсцы Панкратавічы Бабруйскага раёна. Як высветлілася, рэкецірам аказаўся 39-гадовы камерсант з Бабруйска..

Мікалай НАЗАРОВІЧ.

Двое сутак у падвале

Двое сутак пратрымалі два дырэктары віцебскіх фірм са сваімі падначаленымі трэцяга дырэктара ў падвале жылога дома па вуліцы Касманаўтаў, прымусіўшы такім чынам апошняга падпісаць фіктыўны дагавор на перадачу вымагальнікам аўтамабіля "ГАЗ-2410", партыі тавара на 9 тысяч долараў і 5 тысяч долараў.

Дырэктары-рэкеціры і іх падручныя выкрыты ўпраўленнем па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю па Віцебскай вобласці і затрыманы.

"Без яўных прыкмет гвалтоўнай смерці"

Такая фраза суправаджае ў міліцэйскіх пратаколах Віцебскай вобласці ўсе дзесяць фактаў выяўлення трупаў за адны суткі — 21 мая.

Трупы знойдзены ў дварах дамоў, у кустоўі, на берагах азёр і рэк у Віцебску, Віцебскім, Пастаўскім, Гарадоцкім раёнах і на Полаччыне. Асобы траіх з дзесяці раптоўна памёршых яшчэ не ўстаноўлены.

Вольга СІДАРОВІЧ, Белінфарм.

Роздум пасля суда

ЗНЯВАГА

Андрэй СЯРГЕЕЎ

— Суды завалены справамі... Дае збоі адна з галін улады. Але трывожыць не толькі гэта, — распавядаў мне адзін вопытны суддзя, — а матывіроўкі ўчынкаў многіх злачынцаў. У іх — сімптомы небяспекі, якая насоўваецца.

Што ж за яна? І вось я гартаю пратаколы спраў, разгледжаных у Мінскім абласным судзе. Вока раз за разам спыняецца на некаторых з іх.

...Семнаццацігадовы дзяцюк Андрэй, гуляючы ў мікрараёне, "паклаў вока" на дзевяцігадовага Сашку, які сноўдаўся па двары. Заманіў яго ў лес, які падступаў да дамоў, а там — у яміну, зарослую высокай травой, загадаў:

— Здымай нагавіцы.

Малы заўпарціўся — маўляў, холадна. А быў веснавы хмурны дзень. Тады Андрэй добра аддубасіў хлопчыка. І той, плачучы, зняў штаны і трусікі. Пасля чаго, як сказана ў судовай справе, нахабнік "ввёл в задний проход рукоятку перочинного ножа..." Пасля паліў поліэтылен і ім прыпякаў рукі, ногі, іншыя месцы цела хлопчыка...

Не буду пераказваць здзекі з малога, зазначу толькі, што пасля жорсткасці і знявагі над дзіцем Андрэй звязаў яго, заткнуў рот кляпам і пакінуў Сашку ў адной майцы на халоднай зямлі. Добра, што выпадкова натрапілі на яго людзі, якія гулялі па лесе.

Мяне ўразіў не столькі сам выпадак, колькі тлумачэнне злачынцы. На пытанне следчага: навошта ён гэта рабіў, дзяцюк спярша здзівіўся, а потым выпаліў: "Ды проста так. Цікава было".

Проста так! У такім узросце і такія адносіны да малодшага і слабейшага, да жыцця. І не толькі ў Андрэя, навучэнца вячэрняй школы, раней не судзімага.

Маладая дзяўчына Аня наглядала за двухгадовай сястрычкай. Тая капрызіла, плакала. Тады старэйшая ўкруціла яе трохі, вынесла ў лясны масіў побач з дамамі і пачала душыць. Калі сястрычка змоўкла, прысыпала яе цельца снегам і... пайшла гуляць.

Добра, што і тут выпадковыя людзі натрапілі на сугробік, зацікавіліся ім ды выклікалі міліцыю. Дзіцё яшчэ ўдалося ўратаваць.

І зноў здзіўляе сваім цынізмам матывіроўка ўчынку. Маўляў, плакала, перашкаджала ціха пасядзець.

Падобных учынкаў зашмат. І здзяйсняюцца яны не толькі маладымі. Гэтыя толькі капіруюць дарослых.

Слесар Уладзімір прыйшоў дахаты з пляшкай. Селі з бацькам, выпілі ды закусілі. Заспрачаліся. Усё, як заўжды. Але сыну раптам не спадабалася адна думка бацькі: пара б, маўляў, не ўсё прапіваць, нешта пакідаць сабе і на хлеб ды не сядзець на карку ў старога.

— Ты, што, кавалкам хлеба папракаеш? — ускіпеў Уладзімір і тут жа ўчапіўся рукамі за горла бацькі. Пасля пачаў біць. Доўга і ўсім — нагамі, кулакамі, тым, што трапіла пад руку... Медэксперты пазней налічылі аж 45 удараў па целу.

Стары паваліўся на падлогу, стагнаў і ледзьве варушыўся. А маладзейшы бамбіза пайшоў спаць. "Назаўтра, калі я прачнуўся, бацька быў ужо мёртвым, — тлумачыў ён следчаму. — Чаму біў? Ды не спадабаліся яго папрокі, хацеў правучыць як след, каб ведаў пра што гаварыць".

Уладзімір — не закляты п'яніца і раней не асуджаны. Проста любіў падэбашырыць.

Дзесяткі падобных, як дзве кроплі вады, спраў, банальных і жорсткіх. Сыны забіваюць бацькоў, мужы — жонак... З-за чаго? Ды часта "проста так", з-за таго, што нешта не спадабалася ў паводзінах...

За злачынствам заўжды пэўная матывіроўка. Бяруць хабар, займаюцца вымагальніцтвам, крадуць... Каб займець лёгкія грошы, задаволіць нейкія свае матэрыяльныя патрэбы. Хуліганяць, ідуць на згвалтаванні — дзеля задавальнення скажоных амбіцый і жывёльных патрэбнасцей...

Але каб "проста так" ды на такія ўчынкі і ў такім маштабе! Гэта ўжо сімптом цяжкай хваробы грамадства, у якім зневага чалавечай годнасці становіцца правілам, а не выключэннем. Спецыялісты ведаюць: такі сімптом папярэджвае аб насоўванні хмары, з якой можна чакаць самых брыдкіх і непрадказальных ападкаў.

НАРОДНАЯ ГАЗЕТА

ЗАМЕЖЖА

*ІТАР-ТАСС*ІНТЭРФАКС*НАРОДНАЯ ГАЗЕТА*

Пульс дня

Надзея — дыпламатыя

ГААГА. Даць новы імпульс дыпламатычнаму працэсу для таго, каб дасягнуць палітычнага вырашэння канфлікту ў Босніі і Герцагавіне — такая асноўная думка заявы, прынятай удзельнікамі тэрміновага пасяджэння кантактнай групы па Босніі. У ім прынялі ўдзел міністры замежных спраў уваходзячых у кантактную групу Германіі, Вялікабрытаніі, Расіі, ЗША і Францыі.

Сілы ААН — гарант стабільнасці

ПАРЫЖ. Супраць адводу з Босніі сіл ААН выказаўся прэм'ер-міністр Босніі і Герцагавіны Харыс Сілайджыч. У інтэрв'ю, апублікаваным у французскай газеце "Круа", ён падкрэсліў, што адыход "блакітных касак" азначаў бы, што міжнароднае супольніцтва адступіла перад шантажом.

Збіты верталёт пілатавалі ўкраінцы

БЯЛГРАД. Збіты ў нядзелю верталёт, на борце якога знаходзіўся міністр замежных спраў Босніі і Герцагавіны Ірфан Любіянкіч, пілатавалі ўкраінскія лётчыкі. Аб гэтым паведаміла агенцтва Рэспублікі Сербская Краіна "Іскра".

Перспектывы, вядома, ёсць...

БРУСЕЛЬ. Міністры замежных спраў краін Еўрапейскага саюза, абмеркаваўшы перспектыву падпісання гандлёвага пагаднення паміж ЕС і Расіяй, не назвалі тэрмінаў, калі гэта можа адбыцца. Адзінай перашкодай, на думку ЕС, з'яўляецца канфлікт у Чэчні. Разам з тым міністры адзначылі, што на шляху да вырашэння гэтага пытання "дасягнуты пэўны прагрэс".

Супадзенне меркаванняў

ПРАГА. Пазіцыі Чэхіі і Польшчы ў пытаннях пашырэння НАТО і па важнейшых міжнародных праблемах поўнасцю супадаюць, заявілі на сумеснай прэс-канферэнцыі прэм'ер-міністр Чэхіі Вацлаў Клаус і міністр замежных спраў Польшчы Уладзіслаў Барташэўскі, які знаходзіцца тут з афіцыйным візітам. Абодва бакі выступаюць за хутчэйшае павелічэнне колькасці членаў Паўночнаатлантычнага альянсу за кошт прыёму дзяржаў былога сацыялістычнага лагера.

Лік 24380:1 на карысць СНІДу

Да 2000 года 20 мільёнаў жыхароў Афрыкі будуць заражаны СНІДам

20 мільёнаў афрыканцаў да 2000 года будуць заражаны вірусам СНІДу, лічаць эксперты Арганізацыі афрыканскага адзінства (ААА). Генеральны сакратар арганізацыі Салім Ахмед Салім заклікаў краіны Афрыкі да неадкладных дзеянняў для барацьбы з "чумой 20-га стагоддзя".

Салім заявіў, што Афрыканскі фонд аховы здароўя мае 500 тысяч долараў, у той час як патрабуецца 10 мільёнаў.

Эксперты адзначаюць, што пры родах на тысячу афрыканскіх жанчын гінуць ад 500 да 700 парадзіх у параўнанні з 30 на тысячу ў развітых краінах. Кожны год у Афрыцы ад кішэчных захворванняў памірае 1,5 мільёна дзяцей з-за "пагаршэння медыцынскага абслугоўвання" і недахопу ўрачоў.

На Афрыканскім кантыненце адзін доктар прыпадае на 24380 чалавек, а ў развітых краінах — адзін доктар на 380 чалавек.

Агенцтва ІТАР—ТАСС.

Чарнобыль і "вялікая сямёрка"

Нагадаем: Чарнобыльская АЭС складаецца з чатырох рэактараў РБМК-1000. Чацвёрты рэактар Чарнобыльскай АЭС пацярпеў у ходзе аварыі 1986 г. Цяпер функцыяніруюць першы і трэці рэактары, а другі быў спынены пасля пажару 1992 года.

Канструкцыя тыпу РБМК лічыцца састарэлай, больш таго, на Чарнобыльскай АЭС адсутнічаюць многія сістэмы бяспекі, якія на Захадзе лічацца крытычна важнымі, напрыклад, такія, як абаронны каўпак.

На сустрэчы кіраўнікоў краін "вялікай сямёркі" ў Неапалі ў 1994 г. быў прыняты план мерапрыемстваў, які датычыцца энергетычнага сектара Украіны і прадугледжвае спыненне чарнобыльскіх рэактараў у самыя кароткія тэрміны, пры гэтым на такія намаганні выдзялялася першапачатковая сума ў 200 мільёнаў долараў у выглядзе грантаў. У рамках гэтай сумы Злучаныя Штаты выдзелілі 38 млн. долараў. Рашэнне "сямёркі" прынята неўзабаве за рашэннем Еўрапейскага саюза аб выдзяленні грантаў на суму ў 100 млн. ЭКЮ (прыблізна 120 млн. долараў), а таксама дадатковай сумы ў 400 млн. ЭКЮ (прыкладна 480 млн. долараў) у выглядзе крэдытаў на гэтыя ж мэты.

З часу Неапальскай сустрэчы прадстаўнікі "сямёркі" і Украіны працавалі над практычным ажыццяўленнем указанага плана мерапрыемстваў. 13 красавіка адбылася сустрэча сумеснай місіі "сямёркі" і ЕС з прэзідэнтам Украіны Леанідам Кучмай, на якой ён паабяцаў забяспечыць закрыццё Чарнобыльскай АЭС да 2000 года. Адначасова ён запрасіў дадатковую дапамогу ў Захада. У маі сумесная група экспертаў вывучыць патрэбы Украіны ў гэтай галіне, у тым ліку патрэбу ў будаўніцтве электрастанцыі, працуючай на газавых турбінах, узамен Чарнобыльскай АЭС.

У дадатак да гэтага шматбаковага працэсу Злучаныя Штаты і Украіна 10 мая падпісалі заяву аб намерах адносна дапамогі з боку ЗША па ўдасканаленню сістэм супрацьпажарнай і функцыянальнай бяспекі першага і трэцяга рэактараў Чарнобыльскай АЭС, а таксама па стварэнню міжнароднага цэнтра ў Славуцічы пад кіраўніцтвам Украіны па праблемах ядзернай бяспекі і абароны навакольнага асяроддзя. Цэнтр будзе таксама садзейнічаць міжнароднаму супрацоўніцтву ў рамках праектаў, звязаных з ліквідацыяй вынікаў Чарнобыльскай аварыі. Акрамя таго, ЗША і Украіна падпісалі пратакол аб пачатку двухбаковай даследчыцкай праграмы па праблемах рака шчытападобнай залозы і іншых захворванняў, звязаных са шчытападобнай залозай, якія з'явіліся вынікамі аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

Из жизни спецслужб

Захват американцами советской арктической станции СП-8

"Если начнется третья мировая война, ее стратегическим центром будет Северный полюс". Об этом в период "холодной войны заявлял главнокомандующий военно-воздушными силами американской армии Х.Х.Арнольд. И об этом предсказании мир знал. Но еще более сенсационное признание сделал в наши дни профессор из штата Джорджия Уильям М.Лири. Он сообщил" что одна из самых экзотических операций времен "холодной войны" началась в мае 1961 года после того, как американский патрульный самолет, производивший аэромагнитную съемку Северного Ледовитого океана, сообщил об обнаружении покинутой советской дрейфующей станции.

